ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 13 (987) | АЎТОРАК, 19 верасня 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

Рэпартаж з "Дня ведаў"

## СТУДЭНЦТВА – НОВЫ ЖЫЦЦЁВЫ ЭТАП

**Гомельскі дзяржуніверсітэт сёлета ў поўнай меры зведаў дэмаграфічны бум. Упершыню за ўсю гісторыю свайго існавання такім значным па колькасці з'явіўся планавы набор студэнтаў-першакурснікаў – 1000 чалавек.**

**1 верасня, у "Дзень ведаў", па добрай традыцыі новае папаўненне універсітэта ўрачыста пасвячаюць у студэнты.**







...Усе яны, радасна ўзбуджаныя, з усмешкамі на тварах, сабраліся на пляцоўцы перад вучэбным корпусам №1. Настрой у іх – самы цудоўны, бо засталіся ў мінулым хваляванні ўступных экзаменаў, а наперадзе – нязведанае, рамантычнае студэнцкае жыццё!

Гучаць пазыўныя, і пачынаецца ўрачыстасць. Яе вядучыя знаёмяць першакурснікаў з гісторыяй ВНУ, студэнтамі якой гэтым юнакам і дзяўчатам пашчасціла стаць, высокімі ўрадавымі адзнакамі не дасягненняў у навуцы, у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у культурным і спартыўным жыцці. Ім прадстаўляюць ганаровых гасцей свята, а таксама кіраўніцтва універсітэта – рэктара, прарэктараў, дэканаў факультэтаў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый.

Слова прадастаўляецца рэктару члену-карэспандэнту Беларускай акадэміі адукацыі, доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару, заслужанаму работніку адукацыі Рэспублікі Беларусь М.В.Селькіну. Міхаіл Васільевіч горача віншуе першакурснікаў з іх перамогай на ўступных экзаменах і атрыманнем права звацца студэнтамі ГДУ імя Ф.Скарыны – вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся, шчыра жадае ім плённага авалодвання ведамі, каб праз пяць гадоў з гонарам апраўдваць званне спецыяліста новага, трэцяга тысячагоддзя.

Гучыць гімн студэнтаў "Гаўдэамус", і М.В.Селькін уручае сімвалічны студэнцкі білет першакурснікам матэматычнага факультэта Ірыне Партной і Яўгену Гузаву.

Горача і пранікнёна першакурснікаў віншуюць таксама ў сваіх выступленнях першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама С.С.Сідорскі, кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна У.І.Дзервянкоў, загадчык кафедры беларускай мовы прафесар А.А.Станкевіч, старшыня Савета ветэранаў ГДУ, палкоўнік у адстаўцы А.А.Косцікаў. У іх словах – спадзяванне і надзея, што юнакі і дзяўчаты, у якіх пачалося студэнцкае жыццё, змогуць стаць сапраўднымі спецыялістамі, здольнымі вырашаць надзённыя задачы новага, трэцяга тысячагоддзя.



Старшакурснікам ГДУ ёсць што перадаць як эстафету сваім малодшым пераемнікам: выдатныя традыцыі універсітэта ва ўсіх сферах жыцця – вучобе, навуцы, культуры, спорце.У ГДУ 15 студэнтаў з"яўляюцца імяннымі стыпендыятамі, стаў прэстыжным міжнародны маладзёжны фестываль "Арт-сесія", на які прыязджаюць творчыя калектывы з многіх краін далёкага і блізкага замежжа, шмат студэнтаў і выпускнікоў факультэта фізічнай культуры дастойна абараняюць гонар нашай краіны на міжнародных спартыўных спаборніцтвах. І сёлета ўдзельнікамі ХХУ11 Алімпійскіх гульняў у Сіднеі сталі два студэнты факультэта фізічнай культуры – майстар спорту міжнароднага класа па веславанні на байдарках і каноэ Наталля Бандарэнка і майстар спорту міжнароднага класа па дзюдо Сяргей Кухарэнка.

Ад імя ўсёй студэнцкай сям"і ГДУ першакурснікаў вітае трэцякурснік эканамічнага факультэта Мікалай Елісееў, які ўручае сімвалічны Ключ ведаў студэнтцы 1-га курса факультэта замежных моў Вользе Савельевай. У яе словах у адказ гучыць упэўненасць у тым, што новае папаўненне апраўдае ўскладзеныя на яго надзеі.

Гучыць фанаграма з мудрымі словамі беларускага асветніка і першадрукара Францыска Скарыны, імя якога носіць наш універсітэт, аб вялікай важнасці навучання, а потым для віноўнікаў урачыстасці звініць першы універсітэцкі званок. Яго даюць Галіна Рыбальчанка з філалагічнага факультэта і пяцікурснік юрфака Уладзімір Алдошкін.

Цяпер ужо паўнапраўныя студэнты ідуць ў аўдыторыі на сваю першую лекцыю.

Няхай шчаслівым будзе ваш шлях, першакурснікі!

**Т.НІКАЛАЕВА.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

15 - га кастрычніка – выбары

## РАШАЮЧЫ ЭТАП БАРАЦЬБЫ

Менш месяца засталося да дня выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. На мінулым тыдні закончылася праверка пададзеных дакументаў і рэгістрацыя кандыдатаў на мандаты ў вышэйшы заканаўчы орган краіны. Перадвыбарная барацьба выйшла на рашаючы этап. Ад яе ў многім залежыць, хто з прэтэндэнтаў атрымае найбольшы давер у выбаршчыкаў.

Вялікая арганізацыйная і растлумачальная работа па падрыхтоўцы і правядзенню прадстаючых выбараў праводзіцца цяпер і ў нашым універсітэце.

## ПРАХОДЗІЎ ПРАКТЫКУ Ў ААН

Асоба Паўла Рэп"еўскага – адна з самых прыкметных сярод студэнтаў юрыдычнага факультэта нашага універсітэта. І гэта звязана, перш за ўсё, з яго наведваннем Злучаных Штатаў Амерыкі.

Упершыню Павел пазнаёміўся з Амерыкай дзесяць гадоў таму назад. Там ён адпачываў у летнім байскаўцкім лагеры. Затым удзельнічаў у праграме "Дзіця свету", выступаў з дзіцячым тэатрам у штаце Нью-Йорк. На працягу года юнак прайшоў навучанне па праграме школьных абменаў, атрымаў Залаты дыплом выпускніка амерыканскай школы. У мінулым і сёлетнім гадах будучы правазнаўца вывучаў бізнес-права ў каледжы, на працягу двух месяцаў праходзіў практыку ў Сакратарыяце Арганізацыі Аб"яднаных Нацый.

Інтэрв"ю з Паўлам Рэп"еўскім чытайце ў наступным нумары нашай газеты.

## ТАЛЕНАВІТЫМ МАЛАДЫМ ВУЧОНЫМ – СТЫПЕНДЫІ ПРЭЗІДЭНТА



У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб дадатковых мерах па рэалізацыі Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі статуса вышэйшай дзяржаўнай навуковай арганізацыі" з 1 жніўня 2000 г. назначаны стыпендыі Прэзідэнта таленавітым маладым вучоным, кандыдатам навук ва ўзросце да 35 гадоў – пераможцам адкрытых конкурсаў, якія праводзіліся НАН Беларусі ў бягучым годзе.

Сярод стыпендыятаў – намеснік дэкана фізічнага факультэта нашага універсітэта, кандыдат фізіка-матэматычных навук С.А.Хахомаў. На працягу года ён будзе атрымліваць дадаткова сем мінімальных заработных плат у месяц.

### З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбна-метадычную і навуковую работу, актыўны ўдзел у грамадскім універсітэта і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў ЖОГЛА Васіль Гаўрылавіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

АФІЦЫЙНА

# АБ ДАДАТКОВЫХ МЕРАХ ПА РАЗВІЦЦЮ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Згодна Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкі ад 30 жніўня г.г., пачынаючы з 2000 года ўстанаўліваюцца штогод прафесарска-выкладчыцкаму складу і навуковым работнікам дзяржаўных вышэйшых навучальных установ за выдатны ўклад ў развіццё вышэйшай адукацыі 100 персанальных надбавак у памеры 30 тарыфных ставак першага разраду тэрмінам на адзін год.

Зацверджаны Парадак устанаўлення і выплаты персанальных надбавак прафесарска-выкладчыцкаму складу і навуковым работнікам. Кандыдатуры для ўстанаўлення персанальных надбавак будуць вылучацца Міністэрствам адукацыі па прадстаўленню ВНУ па выніках прафесійнай дзейнасці кандыдатаў за апошнія 3 гады па наступных крытэрыях:

— распрацоўка, эксперыментальная апрабацыя і ўкараненне інфармацыйных адукацыйных тэхналогій і прагрэсіўных метадаў навучання;

— распрацоўка і рэалізацыя комплексна-мэтавых праграм (праектаў), якія забяспечваюць якасныя пераўтварэнні ў вышэйшай школе, абнаўленне зместу, метадаў навучання і выхавання студэнтаў;

— асабісты ўклад ва ўдасканаленне арганізацыі навукова-даследчай і навукова-тэхнічнай дзейнасці вышэйшых навучальных установ, у развіццё інтэграцыі навукі і адукацыі;

— укараненне ў навучальна-выхаваўчы працэс, пацверджанае рашэннем савета вышэйшай навучальнай установы:

— аўтарскіх вучэбных курсаў вучэбных планаў, праграм, адукацыйных стандартаў, падручнікаў, навучальна-метадычных дапаможнікаў, якія адпавядаюць сучаснаму айчыннаму і сусветнаму ўзроўню тэхнікі, навукі і культуры;

— дыпломных праектаў, выкананых па заказах прадпрыемстваў з прымяненнем іх вынікаў у вытворчасці (практычнае значэнне і ўкараненне ў вытворчасць пацвярджаюцца адпаведным рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання).

Неабходнасць гэтых надбавак абумоўлена тым, што дзеючыя ўмовы аплаты працы прафесарска-выкладчыцкага складу і навуковых работнікаў дзяржаўных вышэйшых навучальных установ не даюць магчымасці аб"ектыўна ацаніць іх асабісты ўклад у развіццё нацыянальнай вышэйшай школы.

Гэтым жа Указам дзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы вызваляюцца ад падаткаў і непадатковых плацяжоў у пазабюджэтныя фонды, акрамя ўзносаў па дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню і плацяжоў у дзяржаўны фонд садзейнічання занятасці.

Гэта рашэнне дасць магчымасць знізіць памер платы за навучанне, што, у сваю чаргу, пашырыць магчымасці грамадзян у атрыманні вышэйшай адукацыі на платнай аснове.

# ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

На падставе рашэння Савета універсітэта ад 30 жніўня 2000г. па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі 1999-2000 навучальнага года назначаны стыпендыі:

### ІМЯ Я.КАРСКАГА

**МАЛКОВУ** Андрэю – студэнту 5 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці "Гісторыя".

### ІМЯ П.БРОЎКІ

**БРЫЛЁВАЙ** Вераніцы – студэнтцы 4 курса юрыдычнага факультэта.

### ІМЯ Я.КОЛАСА

**МАЛАШАНКА** Наталлі – студэнтцы 4 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Руская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура".

### ІМЯ А.С.ПУШКІНА

**КАЛІНІЧЭНКА** Наталлі – студэнтцы 5 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Руская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура".

### ІМЯ Я.КУПАЛЫ

КАГАН Святлане – студэнтцы 5 курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова".

### ІМЯ К.КРАПІВЫ

**СІМАНЕНКУ** Дзмітрыю – студэнту 3 курса матэматычнага факультэта спецыяльнасці "Матэматыка".

### ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

**ЛІН** Святлане – студэнтцы 3 курса эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве".

**КУПО** Аляксандру – студэнту 5 курса фізічнага факультэта спецыяльнасці "Фізіка" (вытворчае аддзяленне).

### ІМЯ Б.В.БОКУЦЯ

**ПАКАТАШКІНУ** Аляксандру – студэнту 5 курса фізічнага факультэта спецыяльнасці АСАІ (фінансуецца Гомельскай абласной адміністрацыяй Сацыяльна-дэмакратычнай партыі Народнай згоды дадаткова да вучэбнай стыпендыі).

### ІМЯ М.В.ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКАГА

**ЦАЦАРЫНУ** Вячаславу – студэнту 5 курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці "Гісторыя" (фінансуецца Рэчыцкім гарадскім выканаўчым камітэтам дадаткова да вучэбнай стыпендыі).

# НЯЛЁГКА СТАЦЬ І СТУДЭНТАМ-ЗАВОЧНІКАМ

За апошнія гады прыкметна ўзрос конкурс паступаючых у наш універсітэт на завочны факультэт.Так сёлета на 375 месц было пададзена 1232 заявы — на 165 больш, чым летась. У сярэднім на кожнае бюджэтнае і платнае месца прэтэндавала 3,3 чалавека (на дзённае аддзяленне — 2,47). Прыём ажыццяўляўся на 12 спецыяльнасцей (стацыянар — на 29). Упершыню пачнецца падрыхтоўка спецыялістаў за аплату навучання па новай спецыяльнасці — "Лячэбная фізічная культура". У другі раз і таксама за аплату набрана група абітурыентаў, якія ўжо маюць вышэйшую адукацыю і па скарочанай праграме пачнуць набываць спецыяльнасць правазнаўцаў.

Па спецыяльнаму конкурсу (маюць неабходны працоўны стаж, працуюць па абранай або роднаснай спецыяльнасці) паступалі 456 чалавек, па агульнаму конкурсу — звыш 700. Сярод абітурыентаў было 90 медалістаў сярэдніх школ і 59 уладальнікаў дыпломаў з адзнакай.

Самы высокі конкурс склаўся на спецыяльнасці "Бухулік, аналіз і аўдыт", "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" —адпаведна 6,44 і 6,24 чалавека на месца. На рускую мову і літаратуру, беларускую мову і літаратуру ён быў аднолькавым — па 3,88. Найменшая колькасць прэтэндэнтаў на месца — па 2,32 — аказалася на адкрытую спецыяльнасць "Лячэбная фізічная культура".

Уступныя экзамены вытрымалі 551 чалавек, а для 681 абітурыента яны аказаліся не пад сілу.

З другога кастрычніка ў першакурснікаў завочнага факультэта пачнецца ўстановачная сесія.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

# ГОСЦІ З ГОРАДА – ПАБРАЦІМА

Вельмі далёка ад Беларусі знаходзіцца Шатландыя. Але значная геаграфічная адлегласць скарачаецца дзякуючы моцным сяброўскім сувязям, якія ўсталяваліся паміж нашым абласным цэнтрам і горадам Абердзінам паўночнай краіны. Яны сталі пабрацімамі, і абмен дэлегацыямі дзвюх краін — штогадовая рэальнасць.

Цеснае супрацоўніцтва наладжана таксама паміж ГДУ імя Ф.Скарыны і універсітэтам Абердзіна — адным са старэйшых ў Вялікабрытаніі, які мае 500-гадовую гісторыю. Шатландскія госці неаднойчы станавіліся ўдзельнікамі міжнароднага фестывалю "Арт-сесія", які праводзіцца ў нас, пазнаёміцца з горадам-пабрацімам мелі магчымасць і прадстаўнікі нашай ВНУ.

Мінулае лета не стала выключэннем ў падтрыманні сувязей з паўночнымі сябрамі. У г.Гомель прыязджалі старшыня жансавета г.Абердзіна Лэслі Данбар і Карына дэ Голь, якая ўзначальвае фонд "Сябры Гомеля". Праграма іх знаходжання ў нашым горадзе была вельмі шырокай. Яны пазнаёміліся з дзейнасцю жаночых саветаў шэрагу прадпрыемстваў г.Гомеля і на працягу двух дзён былі гасцямі ў ГДУ. Для іх была наладжана сустрэча з кіраўніцтвам універсітэта, у час якой яны падрабязна пазнаёміліся з гісторыяй нашай ВНУ, дзейнасцю яго структурных падраздзяленняў, грамадскіх арганізацый, падрыхтоўкай маладых спецыялістаў на факультэтах замежных моў, псіхалогіі, у Франка-Беларускім інстытуце кіравання. Прадметам асобнай гутаркі з гасцямі была работа жансавета ГДУ, які ўзначальвае дацэнт Т.І.Язэпава.

У сваю чаргу шмат цікавага госці расказалі аб тым, як працуюць мэрыя, фонд "Сябры Гомеля" па далейшым развіцці сувязей з беларусамі, аб універсітэце г.Абердзіна.

Шатландскія сябры азнаёміліся з экспазіцыяй Веткаўскага музея народнай творчасці, зрабілі экскурсію па парку імя Луначарскага.

**Т. ДУБЯК.**

# МЫ АПЫНУЛІСЯ Ў XIX СТАГОДДЗІ

**Навучальны год толькі пачаўся. Наперадзе ў студэнтаў шмат адкрыццяў на шляху ў спасціжэнні абранай прафесіі. Цікавасць да вучобы, як паказала практыка, у студэнтаў узрастае, калі заняткі праводзяцца нетрадыцыйна, з творчым падыходам, як, напрыклад, у канцы кожнага навучальнага года ў старшакурснікаў філалагічнага факультэта спецыяльнасці "Руская мова і літаратура". Аб гэтым у матэрыяле, які публікуецца ніжэй.**

На філалагічным факультэце склалася цудоўная традыцыя — заканчэнне амаль кожнага літаратурнага курса падсумоўваць сцэнічнай пастаноўкай, прысвечанай або ўсяму вывучанаму перыяду, або аднаму з выдатных дзеячоў той эпохі. Гэтыя творчыя вечары, мы, студэнты, заўсёды робім самі, прычым з вялікім задавальненнем.

Так было і ў канцы мінулага навучальнага года. Вывучэнне курса "Гісторыя зарубежнай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя" трэцякурснікі завяршылі творчым вечарам, пастаўленым пад кіраўніцтвам ст.выкладчыка кафедры рускай літаратуры А.А.Дарафеевай. Ён прысвячаўся культуры Заходняй Еўропы XIX ст.

Галоўны сцэнарыст Марына Мех і студэнты-"акцёры" знайшлі цудоўны спосаб паказаць нам і літаратуру, і музыку, і жывапіс мінулага стагоддзя ў комплексе, у яднанні.

Спачатку на імправізаванай сцэне аўд.2-2 з'явіўся сам "XIX век" у выкананнні А.Назаравай. Ён расказаў нам аб сабе, аб усіх войнах, рэвалюцыях, пераваротах, народных рухах: "І ўсё гэта ўвасобілася ў творчасці вялікіх майстроў мастацтва, якія выраслі ў ва мне і праславілі мяне! Музы паэзіі, музыкі, жывапісу натхнялі іх, былі іх вечнымі спадарожніцамі". І тут у зале сапраўды з'явіліся тры музы ў выкананні А.Вярбіла, В.Сяргеенка, М.Мех і напоўнілі яе цудоўным дыханнем мастацтва мінулага стагоддзя. Кожная імкнулася паказаць нам лепшыя дасягненні ў сваёй галіне. Сцены залы ўпрыгожвалі рэпрадукцыі карцін Дэга, Э.Манэ, К.Каро, Міле, старанна падабраныя студэнтамі.



У выкананні лепшых чытальнікаў нашага курса гучалі цудоўныя вершы Бадлера, Сцівенсона, Э.Джонса, П.Верлена і інш. І ўсё гэта суправаджалася цудоўнай музыкай Штрауса, Вердзі, Бізэ, Грыга. Трэба сказаць, што гэта ўражвала. Студэнты ярка паказалі свой творчы патэнцыял і выдатныя творчыя здольнасці.

Гледачамі ў зале былі студэнты старэйшых і малодшых курсаў, выкладчыкі кафедр рускай літаратуры, беларускай мовы, беларускай літаратуры і інш. Ганаровымі гасцямі з'яўляліся дэкан філфака У.А.Бобрык, загадчыца кафедры рускай літаратуры Л.Л.Ермакова і старшыня дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, загадчык кафедры рускай і замежнай літаратуры Мазырскага педінстытута імя Н.К.Крупскай В.І.Анісімаў.

Пасля заканчэння дзейства я пацікавілася ў нашых ганаровых гасцей, ці спадабаўся ім наш творчы вечар, і як яны наогул адносяцца да такой самастойнай работы студэнтаў. Без падману магу сказаць, што яны былі ў захапленні. А на другую частку майго пытання адказалі наступнае:

**У.А.Бобрык**: — Такія мерапрыемствы я толькі вітаю і лічу, што яны прыносяць студэнтам вялікую карысць, спадзяюся на іх працяг у наступным годзе.

**Л.Л.Ермакова**: — Кафедра рускай літаратуры на працягу шэрагу гадоў актыўна прапагандуе творчыя заняткі. Студэнты-старшакурснікі былі пастаноўшчыкамі і ўдзельнікамі інсцэніровак народнага вяселля, Купалля, драматычных народных твораў, тэатра Пятрушкі, нават аповесці "Бедная Ліза" М.М.Карамзіна. Гэта мерапрыемства сведчыць не толькі аб узрастаючым майстэрстве выканаўцаў, але і аб глыбіні пранікнення ў інсцэніраваны матэрыял. Слова, жывапіс, музыка пагружалі нас у мінулую эпоху. Заходнееўрапейская культура XIX ст. літаральна ажывала на нашых вачах. Упэўнена, што гэты вопыт спатрэбіцца ў час праходжання вучэбнай практыкі ў школе.

**В.І.Анісімаў**: — Гэта было ўнікальна, нечакана. Студэнты так узбуйнена падалі веды пра эпоху, ахапілі ўвесь агульнакультурны дыяпазон. Без такіх творчых работ студэнтам нецікава вучыцца. Ды і не можа студэнт поўнасцю раскрыцца на стандартных занятках. А так яны маюць магчымасць поўнасцю прадэманстраваць свой творчы патэнцыял.

Пасля такіх пахвальных слоў я магу павіншаваць сваіх аднакурснікаў з удачай і думаю, што мы яшчэ не раз парадуем гледачоў такімі пастаноўкамі.

**В.ЗАБАРОЎСКАЯ,**
**студэнтка гр.Р-41**
**філалагічнага факультэта.**

# СУСТРЭЧА З БУДУЧЫМІ ЖУРНАЛІСТАМІ



У нашым універсітэце ў новым навучальным годзе на спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" уведзена спецыялізацыя "Літаратурная работа ў газетах і часопісах". Тут пачалі навучацца 30 студэнтаў, якія свой далейшы лёс мяркуюць звязаць з журналістыкай. Некаторыя з іх вучацца па мэтавых накіраваннях раённых рэдакцый, якія знаходзяцца на тэрыторыях, найбольш пацярпелых у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Адкрыццё данай спецыялізацыі — вострая патрэба часу. Як паказвае жыццё, выпускнікі факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў апошнія гады не прыязджаюць на працу ні ў абласную газету, ні ў раённыя. З адкрыццём спецыялізацыі мяркуецца з цягам часу "наталіць голад" на журналісцкія кадры, што існуе ў нашым рэгіёне.

Звязвае свае надзеі на перспектыву з выпускнікамі гэтай спецыялізацыі і абласная газета "Гомельская праўда". А таму і заканамерна, што ў самым пачатку навучальнага года, па ініцыятыве кіраўніцтва рэдакцыі, у ГДУ адбылася сустрэча са студэнтамі, у якой прынялі ўдзел галоўны рэдактар, старшыня абласной арганізацыі Беларускага саюза журналістаў В.М.Логвін, яго першы намеснік С.М.Бяспалы, рэдактар аддзела А.Ф.Клыга. Яны расказалі пра спецыфіку работы ў сродках масавай інфармацыі, у прыватнасці, у газеце "Гомельская праўда" і яе выданнях, адказалі на шматлікія пытанні.

Аб рабоце Беларускага тэлеграфнага агенцтва (БелТА) удзельнікам сустрэчы распавядаў яго фотакарэспандэнт С.П.Халадзілін.

У сустрэчы прынялі ўдзел дэкан філалагічнага факультэта У.А.Бобрык, яго намеснікі Л.П.Кузьміч і С.І.Ханеня.

*По слядах жнівеньскай нарады*

# ПАДЗЯКА ЎПРАЎЛЕННЯ АДУКАЦЫІ

Упраўленне адукацыі Гомельскага гарвыканкама выказала падзяку супрацоўнікам ГДУ прафесару А.А.Станкевіч, кандыдату філалагічных навук С.І.Ханеню з філалагічнага факультэта за высокі ўзровень падрыхтоўкі і правядзення жнівеньскай канферэнцыі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры школ г.Гомеля і дацэнту З.М.Сямейных, ст. выкладчыкам В.І.Сычову і Я.А.Броўкіну з гістарычнага факультэта за актыўны ўдзел у жнівеньскай секцыі настаўнікаў гісторыі.

**Вузы и СЭЗ — шаги навстречу**

# ВЫСОКАЯ ОЦЕНКА ДИПЛОМНЫХ ПРОЕКТОВ



В администрации свободной экономической зоны «Гомель-Ратон» убеждены, что главная стратегическая задача — сделать гомельскую СЭЗ мощным центром экономического, технического и финансового развития региона — будет реализована теми специалистами, которых сегодня готовят вузы Гомельщины.

Для некоторых из таких студентов последний семестр прошлого учебного года завершился не совсем обычно. Это относится прежде всего к тем выпускникам гомельских вузов, дипломные проекты которых были написаны по тематике, связанной с деятельностью СЭЗ «Гомель-Ратон». Пусть не все из них, а пока лишь единицы, по рекомендациям советов университетов, были удостоены стипендии администрации СЭЗ «Гомель-Ратон» и получали ее с марта по июнь в размере четырех минимальных заработных плат. Это в дополнение к обычной стипендии.

В числе стипендиатов гомельской СЭЗ в этом году были: Федор Пашечко, студент 5-го курса гуманитарно-экономического факультета Гомельского государственного технического университета имени П.О.Сухого; Тамара Бородина, выпускница экономического факультета ГГУ имени Ф.Скорины и студент 5-го курса факультета промышленного и гражданского строительства БелГУТа Андрей Свидунович. Соответственно единовременные премии в размере шести минимальных зарплат получили их научные руководители: ст. преподаватель ГГТУ М.О.Гиль, доцент кафедры бухучета ГГУ Л.М.Кравец и профессор БелГУТа И.Г.Малков.

К сказанному следует добавить следующее. Стипендии выдаются не только за написание дипломной работы по тематике СЭЗ. Обязательным условием является также хорошая и отличная успеваемость в течение пяти последних семестров. Будущему выпускнику администрация СЭЗ вручает в торжественной обстановке свой диплом, подтверждающий право на получение этой стипендии.

Кроме того, в нынешнем году впервые в названных университетах среди остальных дипломников был проведен конкурс на лучший дипломный проект по тематике, связанной с функционированием СЭЗ «Гомель-Ратон». Недавно в ее администрации состоялось заседание специальной конкурсной комиссии, на котором были рассмотрены представленные вузами дипломные проекты.

Лучшим дипломным проектом среди работ ГГУ имени Ф.Скорины комиссия признала исследование выпускника юридического факультета Александра Янгуразова, написанное на тему «Деятельность свободных экономических зон в Республике Беларусь: проблемы и перспективы правового регулирования». Высокую оценку получил и проект выпускницы БелГУТа Светланы Королик на тему «Особенности экономической оценки инвестиционных проектов в условиях свободной экономической зоны».

К лучшим также отнесен дипломный проект выпускницы ГГТУ имени П.О.Сухого Юлии Гусевой на тему «Проблемы государственного регулирования предпринимательского сектора». Комиссия посчитала, что эта работа имеет непосредственное отношение к проблемам СЭЗ, так как в ней изложены те преимущества, которые предоставляются предпринимателям в свободной экономической зоне при организации новых предприятий.

Юлии Гусевой, Светлане Королик и Александру Янгуразову за дипломные работы присуждены единовременные премии в размере четырех минимальных заработных плат. Премии таюке получают научные руководители этих дипломных проектов — доцент ГГТУ имени П.О.Сухого П.А.Минчукова, профессор БелГУТа В.П.Бугаев и ст. преподаватель ГГУ имени В.Скорины С.Г.Шулейко.

**Виктор ЛУГОВОЙ.**

**Летняя практыка**

# ПАДАРОЖЖА Ў СКАРБНІЦУ СЛОВА

Летняя практыка для многіх студэнтаў лета – час адпачынку і перыяд нарыхтоўкі садавіны ды гародніны на зіму. Але ж не для ўсіх: першая палова лета – самая гарачая пара для студэнтаў. Гарачая нават не з-за спякоты: плённая чэрвеньская праца на працягу выніковай летняй сесіі змяняецца цікавай і поўнай уражанняў ліпеньскай практыкай. Не выключэннем для нас, студэнтаў філалагічнага факультэта, стаў і гэты год. Другакурснікі філфака спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" са спецыялізацыяй "Англійская мова" былі накіраваны на дыялекталагічную практыку ў Добрушскі раён.

... Першы дзень практыкі. Узбуджаная, але яшчэ крыху заспаная група студэнтаў адносна ўтульна размясцілася ў прыгарадным цягніку. Сярод дзяўчат сціпла прымасціўся і аўтар гэтых радкоў, крыху далей – малады кіраўнік практыкі, выкладчык кафедры беларускай мовы Рыгор Уладзіміравіч Серыкаў. Няспешна цячэ размова, успамінаюцца ўсе "прыгоды" мінулай сесіі. Хтосьці дрэмле, прытуліўшыся да пляча суседкі, хтосьці пазірае праз акно на жывапісныя мясціны Добрушчыны. Зялёныя лясы і палеткі чаргуюцца з дачнымі сядзібамі, дзе там-сям віднеюцца схіленыя да раллі постаці людзей.

І вось першая вёска Івакі. Невялікая чыгуначная станцыя, зацікаўленыя позіркі вяскоўцаў прыцягвае група моладзі з канспектамі ды дыктафонамі. Бабулькі ў ценю каля хат. Вітаемся, тлумачым мэты практыкі, распытваем вяскоўцаў. Адразу заўважаем, што на рускай мове размаўляць з насельніцтвам лягчэй. І нахлынаюць успаміны пра старыя часы, цікавыя, самабытныя і часам вельмі смешныя. Апавядаюць бабулі аб паходжанні назваў азёр, рэк, сажалак, апісваюць даўнейшыя віды адзення, абутку, прылад працы.

Вясковы настаўнік запрашае ў хату, амаль што загадвае пакаштаваць дамашняга малака, ягад, мясцовых страў. Моршчаць дзяўчаты носікі: напэўна, не ўсім падабаецца пачастунак. Але ж адмаўляцца нельга.

За час пошуку наступнага інфарматара насычаемся вітамінамі – вельмі ж прываблiваюць спелыя вішні, сакавітыя, хаця і недаспелыя, яблыкі. А вось і мясцовая крама. Што ж, даволі неблагі асартымент. Нават неяк нязручна без пакупкі пайсці.

І зноў запісы, размовы, пытанні. У астатні час гуляем па вёсцы, наведваем помнікі і гістарычныя мясціны, стары цяністы парк, зялёны бераг зарослага чаротам азярца. У прызначаны час збіраемся на станцыі. Вакол – зусім іншыя твары, усе крыху стомленыя, але задаволеныя, поўныя ўражанняў. Наперабой дзелімся імі з кіраўніком практыкі, старанна аналізуем усе дэталі.

... Вёскі Гардуны, Цэрахоўка, Кругавец, Прудоўка, Вуць. Вялікія і не вельмі, але ж нейкія незвычайныя, поўныя нязведанай таямнічасці і спакою. Спагадлівыя, добразычлівыя людзі. Прыемна нават, калі бабулі запрашаюць у хату трох-чатырох чалавек вось так адкрыта і не баючыся. Вядома, робяць гэта не ўсе: хваля крыміналу наведвае і гэтыя ціхія прыгожыя куткі. Да размоў з адным з інфарматараў ахвотна далучаюцца і суседкі: "свежыя" людзі ў вёсцы – не такая ўжо частая з'ява. Пад час збору матэрыялу знаёмімся з мясцовымі аднагодкамі. Размовы, жарты, запрашэнні... Студэнты – народ жвавы, і амаль уся група імкліва прымае рашэнне застацца ў Цэрахоўцы на свята Купалля, таямнічыя падрабязнасці падзей якога хавае чароўная ліпеньская ноч...

Шмат разоў будуць перагортвацца ў памяці старонкі практыкі. Ці можна забыць моцны лівень, які перачакалі ля вясковых могілак, ці калектыўную прабежку, калі адна з хатніх рагатых жывёлін вырашыла пазнаёміцца з намі бліжэй? Колькі дасціпных жартаў было потым! Даставалася "на гарэхі" (як кажуць у некаторых вёсках Добрушчыны) і мне, але такая ўвага з боку дзяўчат даволі прыемная. Не даводзілася сумаваць і нашаму кіраўніку: сур'ёзны і сабраны на занятках ва універсітэце, Рыгор Уладзіміравіч жартаваў і смяяўся разам з усімі.

Самыя адчайныя практыканты дабраліся і да манумента Дружбы на мяжы трох братніх краін – Расіі, Беларусі і Украіны каля вёскі Кругавец. Крыўдна, што наведаць яго можна толькі пасля мытнай праверкі. Але ж, на маю думку, сяброўству і добрасуседству славянскіх народаў ніякія межы не пашкодзяць.

...Скончана практыка, сабраны каштоўны дыялекталагічны матэрыял. Спадзяемся, ён добра паслужыць пры складанні слоўнікаў гаворак Гомельшчыны, напісанні навуковых прац. А мы ж будзем яшчэ доўга прыгадваць з нашых вандровак нешта добрае, самабытнае, хвалюючае...

**Сяргей АРЦЁМАЎ,**
**студэнт гр. БА-33**
**філалагічнага факультэта.**

# ЖИЗНЬ ПРОЖИТЬ – НЕ ПОЛЕ ПЕРЕЙТИ

На стук в калитку первого дома ответила тишина, второй дом оказался заколоченным, в третьем — дверь была заперта изнутри, и нам никто не открыл, в четвертом нас «поприветствовали» звонким лаем. Вот так «радушно» началась прошедшим летом диалектологическая практика в деревне Медвежий Лог для студентов группы РБ-23 филологического факультета. Жутковато было ходить по пустой глухой улице, заглядывать в дома, где уже давно никто не живет. На вопрос, куда все подевались, Нина Ивановна Давыдова (одна из тех бабушек, с которыми нам все же удалось побеседовать) ответила, что половина деревни умерло, и сейчас здесь в основном живут дачники. Так оно и оказалось. Большую часть села занимали дачи и огороды. Естественно, у дачников-горожан не было смысла узнавать содержание свадебного обряда или святок. И бедным студентам ничего не оставалось, как обрушить на менее несчастных и немного напуганных немногочисленных бабушек уйму вопросов, причем самой разнообразной тематики. Так Фекла Савельевна (91 год), у которой оказалась княжеская фамилия Годунова, сначала рассказывала девчонкам о растениях и животных, а потом, когда мы стали спрашивать о похоронном обряде, очень удивилась и спросила, кто еще к ней зайдет после нас. «Тут вчера были ваши, мальчики только. Тоже пришли поговорить, а потом просили мак. Весь огород потоптали», — вздохнула женщина. Мы успокоили ее и уверили, что нам ничего не нужно, тем более мака.

Фекла Савельевна оказалась очень доброй и разговорчивой. Несмотря на то, что нашу тему «похорон» никак не назовешь веселой, она умудрилась довольно немрачно рассказать о том, как, например, умирали колдуны, как в старину представляли смерть и душу. А вот Анастасия Михайловна Побегаева оказалась носительницей интересного диалекта, и мы с удовольствием записали ее речь. На наш вопрос, почему нам не открывают двери другие жители Медвежьего Лога, она сказала, что люди просто боятся незнакомых — не доверяют. Но все же встретились нам приветливые и доверчивые жители. Так гостеприимным хозяином оказался житель N ( с ним мы, к сожалению, даже не познакомились как следует). Он нам не мог ничего рассказать насчет обрядов, но зато напоил нас с Наташкой молоком и угостил домашними пирожками.

Деревню мы покидали уставшие и, надо сказать, настроение наше нельзя было назвать приподнятым. Было обидно за этих одиноких пожилых людей; было стыдно за наше «прогрессивное» человечество, которое не способно хоть чем-то помочь им; и было больно слышать от каждой нашей собеседницы одни и те же слова: «Ох, мои детки, я так устала жить, быстрей бы умереть».

И вот дизель увозит нас из этой глухой грустной деревни, от этих добрых и одиноких людей. С собой мы везем не только информацию об их прошлом, их культуре и традициях — с нами осталась частичка их воспоминаний, жизненной тревоги, мудрой старости, надежд и обид. Теперь мы знаем точно: «Жизнь прожить — не поле перейти».

**Татьяна ЦЕЛЕХОВИЧ,**
**студентка гр. РБ-33 филологического факультета.**

**После события**

# МОЙ ПУШКИН – НАШ ПУШКИН

**Открытие минувшим летом бюста гения русской литературы А.С.Пушкина возле охотничьего домика в парке имени Луначарского стало памятным событием в жизни нашего города, ярким свидетельством того, как чтим мы великий талант, волнующий людские сердца и души почти два столетия. На открытии бюста выступал и доцент кафедры русской литературы нашего университета, член Союза белорусских писателей Иван Афанасьев. Его проникновенные слова о Пушкине очень ярки , образны, и сродни добротной публицистике. Вчитайтесь в них и вы.**




-- Мы открываем памятник Александру Сергеевичу Пушкину. Остались в прошлом споры о том, каким этому памятнику следовало быть. Наверное, разным, потому что у каждого, пришедшего сюда, — Пушкин свой. Каждый из нас сегодня может смело повторить вслед за Мариной Цветаевой: мой Пушкин и только в этом глубоко личном постижении поэта обрести для себя его слово, его мысль и его образ.

Мой Пушкин – это Божьей милостью творец, приблизивший к нам историю в ее человеческом измерении: в «Капитанской дочке» и «Маленьких трагедиях», «Евгении Онегине» и поэмах, «Истории Пугачева» и «Борисе Годунове». Даже в нашем безмолвии чудится его неизбывное присутствие. Помните: народ безмолвствует?.. В самом же Пушкине обрела силу нетленного поэтического слова совесть, даруя последнее утешение грешнику и призывая к жертвенному служению праведника. Впрочем, от нас с вами, кажется, требуется совсем немного. Благодаря Александру Сергеевичу мы и сейчас с историей на дружеской ноге и в качестве первооткрывателей памятника уже приглашены в ее торжественно-величественный ряд, в 1880 году ознаменованный памятной речью Ф.М.Достоевского на открытии пушкинского памятника в Москве, а в году 2000-м продолженный его соотечественниками-белорусами в Гомеле. Главное – не забыть, что на дружеской ноге с великим поэтом бывал и некто Хлестаков, а от бубенцов «птицы-тройки», на которой разъезжал известный собиратель мертвых душ господин Чичиков, этот звон стоит в ушах и на пороге XXI века: того и гляди, заявится сюда корыстолюбец-искуситель из поэмы Гоголя, сюжет которой был подарен автору тоже Александром Сергеевичем. И ведь примчится не праздного любопытства ради, а опять же – собственной корысти для. На поживу. Только вот кого встретит здесь, сейчас? Знаем ли сами? Можем ли ответить? Гоголевское пророчество о Пушкине как русском человеке, каким он, может быть, явится через 200 лет, увы, не исполнилось. Да и мы, белорусы, (так вышло), — только в начале пути. И если Пушкин – тоже наша точка отсчета, то прежде всего потому, что вся новая и новейшая европейская история прошла под знаком его откровения.: Гений и злодейство – две вещи несовместные». Век XVIII, подаривший миру гения Пушкина, уже никогда не будет отторгнут веком XX, который именно в слове поэта обрящет свой самый главный урок. А значит, и тем, кто мнит себя почитателями великого Пушкина, предопределено быть современниками всех времен. Горько, если памятник певцу вольности, свободы станет всего лишь напоминанием о ней. Больно, если тропу к нему будет торить самоуверенный схоласт, о котором сам Пушкин отзывался без всякого почтения: «Избавлен чином от ума...»

Пушкин – поэт живой, изменчивый. Наверное, ему, непоседе, будет немного не по себе от этого мемориального величия. Острослов и насмешник, он готов позабавиться и с нами, вновь с лицейским задором вбежать в большую поэзию на тоненьких эротических ножках и произвести переполох, как однажды написал об этом Синявский-Терц, дерзнувший с Пушкиным прогуляться. Однако какова цена этой прогулки! И как поучительна перемена в этом естественном человеческом движении, когда дамский угодник заканчивает свой земной путь защитником дамской чести, не только творчеством, но и жизнью своей свидетельствуя нам возможность благодатной перемены во всех наших тяготах и заботах. Быть может, именно поэтому «мой Пушкин» – наш Пушкин – как никто другой олицетворил идею всемирной отзывчивости русской культуры, которой с благоговейной памятью о поэте посвятил свою Пушкинскую речь Ф.М.Достоевский. Даст Бог, этот отзвук воплотится когда-нибудь и в памятниках нашим выдающимся писателям-землякам, многих из которых позвала в большую литературу пушкинская лира.

# АБ ЖЫВОЙ ГІСТОРЫІ НАРОДА

Яшчэ адна цікавая навінка на паліцах кнігарняў: том папулярнага "Беларускага кнігазбору" – кніга выбраных твораў нашай гродзенскай пісьменніцы XIX стагоддзя, класіка сусветнай літаратуры Элізы Ажэшка.

У кнізе сабраны найбольш значныя яе аповесці і апавяданні "беларускага цыкла", у якіх раскрываецца жывая гісторыя нашага народа, расказваецца пра тое, як жылі і кахалі, працавалі і весяліліся нашы продкі.

Уяўляю, з якой асалодай будзе смакаваць чытач "густую" прозу Элізы Ажэшка, з якой неадрыўнай цікавасцю будзе сачыць за драматычнымі момантамі жыцця многіх яе герояў.

Прыемнай неспадзяванкай для чытача будуць і цікавыя ў многіх адносінах, надзвычай паэтычныя нарысы Элізы Ажэшка "Людзі і кветкі над Нёманам", якія на працягу 1888-1891 гадоў публікаваліся ў этнаграфічным часопісе Яна Карловіча "Вісла" і з таго часу нідзе не выходзілі. У гэтых нарысах пісьменніца падала 228 беларускіх назваў раслін, апісала выкарыстанне іх у народнай медыцыне, у лячэнні асобных хвароб, што і сёння можа дапамагчы людзям.

Творы Элізы Ажэшка перастварылі на беларускую мову Янка Брыль, Ядвіга Бяганская і Галіна Тычка. Уступны артыкул "Каралева жывога слова" напісала Валянціна Гапава.

**Кастусь ЦВІРКА,**
**галоўны рэдактар**
**"Беларускага кнігазбору".**

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб правядзенні агульнауніверсітэцкага конкурсу "Ану, першакурснік -- 2000 !"

Штогод ва універсітэце праводзяцца конкурсы мастацкай самадзейнасці з мэтай развіцця творчай ініцыятывы, культурнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў. Адным з этапаў гэтых конкурсаў сярод студэнтаў 1-га курса з"яўляецца "Ану, першакурснік!"

Сёлета агульнауніверсітэцкі конкурс будзе праходзіць на працягу двух дзён. Яны вызначаны на мастацкім савеце:

**20 кастрычніка**: біялагічны факультэт
факультэт замежных моў
геолага-геаграфічны факультэт
юрыдычны факультэт
гістарычны факультэт
факультэт псіхалогіі;

**21 кастрычніка**: філалагічны факультэт
факультэт фізічнай культуры
фізічны факультэт
эканамічны факультэт
матэматычны факультэт.

У конкурсе прымаюць удзел ТОЛЬКІ студэнты першага курса. Дапускаецца акампанемент з боку, а таксама ўдзел не першакурснікаў у парных выступленнях для цэльнасці нумара і праграмы, яе мастацкага ўзроўню.

Працягласць выступлення кожнага калектыву – не больш 35 мінут (5 мінут кантрольных).

Конкурсныя праграмы павінны быць здадзены 16, 17 кастрычніка на сцэне актавай залы. 19 кастрычніка павінны быць прадстаўлены аддрукаваныя праграмы ў колькасці 10 экземпляраў.

У гэтым годзе калектывы рыхтуюць свае праграмы па абавязковай тэме: "Свята, якое заўсёды з намі". Непасрэдна выбар жанру, у якім рыхтуюць свае праграмы калектывы, – самастойны і свабодны. Праграмы павінны быць цікавымі і змястоўнымі. Журы ацэньвае раскрыццё тэмы, цэльнасць і align разнажанравасць праграмы, а таксама акцёрскае і выканаўчае майстэрства. Уся праграма ацэньваецца па 10-бальнай сістэме.

Вынікі конкурсу і ўзнагароджванне прызамі з уручэннем пераходнага прыза будуць пасля заканчэння другога конкурснага дня.

Праграмы ацэньваюцца журы, у якое ўваходзіць 7 чалавек. Гэта прадстаўнікі рэктарата, студэнцкага клуба ГДУ, студэнцтва і запрошаныя спецыялісты па розных жанрах.

Палажэннен аб конкурсе прынята на мастацкім савеце культурнага цэнтра ГДУ імя Ф.Скарыны 5 верасня г.г.

**Спорт**

# ВЯРНУЛІСЯ НА РАДЗІМУ З "СЕРАБРОМ"

У Грэцыі адбыліся фінальныя гульні на першынство Еўропы па ручному мячу сярод юніёраў. На турніры выдатна выступіла каманда Рэспублікі Беларусь. Яна ўпершыню заваявала сярэбраныя ўзнагароды, у заключным паядынку ўступіўшы гандбалістам Югаславіі.

У дасягнуты поспех унеслі свой уклад і студэнты факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта У.Хузееў і В.Цітоў.

**(Наш кар.)**

**Так бы и у нас**

# КРЕДИТЫ ДЛЯ СТУДЕНТОВ



Хорошая новость для студентов российских коммерческих вузов. Теперь они смогут одолжить деньги на учебу у государства. С 1 августа Сбербанки начали выдавать целевые кредиты на образование. Получить их может любой, кто учится в платных учебных заведениях или только поступил туда. Надо только принести соответствующую справку из вуза, которая подтверждает это. Максимальная величина и срок кредита – 10 тысяч долларов на десять лет. Ссуда дается под 22 процента годовых, и ее придется выплачивать ежемесячно. Государство помогает оплатить лишь 70 процентов стоимости обучения. 30 процентов студент должен заплатить из своего кармана. Кредит могут получить законные представители студента – родители, опекуны, попечители. По мнению банковских работников, выгоднее всего эти кредиты студентам, которые собираются сами оплачивать свое образование. Поскольку Сбербанки предоставляют отсрочку платежа на время обучения, но не больше, чем на пять лет. То есть весь период, пока студент учится, он выплачивает каждый месяц лишь проценты. Окончив вуз и найдя работу, заемщик начинает рассчитываться с долгами, тоже в течение пяти лет.

**«АиФ-дайджест».**

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

—матэматычных праблем кіравання – дацэнта;
—геалогіі і разведкі карысных выкапняў — ст. выкладчыка (0,5 стаўкі);
грамадзянска-прававых дысцыплін – асістэнта;
аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры – дацэнта;
матэматычнага аналізу – ст.выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 509
Падпісана да друку 15.09.2000